- У правапісе 1959 ёсць асобны параграф аб чаргаванні галосных у некаторых каранях слоў: інфармацыя сёння выдаецца неактуальнай; слушна зняты ў 2008.
- Правапіс ненаціскных галосных у суфіксах назоўнікаў, прыметнікаў, дзеясловаў, дзеепрыметнікаў: без змен.
- Правапіс галосных у абрэвіятурах:

  пры напісанні складанаскарочаных слоў часткі слова пішуца як у поўных словах, у апошняй частцы ўжо не аднаўляецца пад націскам этымалагічнае ***о*** (*прафкам – прафсаюзны камітэт, інтэрпал – інтэрнацыянальная паліцыя, лінкар – лінейны карабель*; раней – *райком, селькор).* Як і раней, пасля канцавых цвёрдых зычных першай часткі складанаскарочаных слоў пачатковае ***і*** другой часткі застаецца нязменным (цяпер і раней *педінстытут, санінструктар*).

У прадмове да "Правілаў" 2008 года падкрэсліваецца, што ў беларускім правапісе не адбылося фундаментальных зменаў, гэта не новыя правілы, а частковыя змены існуючага правапісу, які ў цэлым забяспечвае свабоднае і поўнае функцыянаванне пісьмовай мовы ва ўсіх сферах выкарыстання і не патрабуе кардынальных змен. Гэта ўдакладненні з мэтай удасканалення, аптымізацыі і уніфікацыі правілаў, з мэтай прывядзення іх у адпаведнасць з сучаснай моўнай практыкай. Падобнае меркаванне цалкам пацвярджаецца нашым кароткім аглядам змен, што адбыліся ў правапісе галосных у беларускай мове. Аднак, на жаль, асобныя правілы з-за некаторай, на наш погляд, сціслацці выкладання, недастатковай інфарматыўнасці і адсылкі напісання да слоўніка як адзінай нарматыўнай крыніцы па-ранейшаму "не з'яўляюцца цвёрдым крытэрыем для адзінага і паслядоўнага напісання" [2, с. 9], што, відаць, пакідае прастору для навуковай думкі нашым нашчадкам.

**Літаратура**

1. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск: Нац. цэнтр прававой інфарм. Рэсп. Беларусь, 2008. – 144 с.
2. Правілы беларускай арфаграфіі і пунктуацыі. – Мінск: Выд-ва АН БССР, 1959. – 160 с.

**А. А. Радзевіч**

## АНАЛІЗ ХАРАКТАРУ ІНФАРМАЦЫІ Ў ТЭКСЦЕ

Праверка кантрольных работ паказала, што студэнты не заўсёды ўдумліва падыходзяць да выканання заданняў, у большасці выпадкаў "літаральна" выкарыстоўваючы ўзоры зборніка "Сучасная беларуская мова: Кантрольныя работы для студэнтаў завочнага аддзялення…"

Тэкст – аб'ект унікальны ўжо сам па сабе, таму пры яго апісанні зыходным павінны быць канцэптуальны падыход, заснаваны на індывідуальным асэнсаванні мадэлі свету, прапанаванай тым ці іншым аўтарам. Схема комплекснага аналізу тэксту і скіравана на гэта.

Выяўленне характару інфармацыі – толькі адна з пазіцый, але вельмі важная для дакладнага разумення тэкставай прасторы, бо змест – гэта яе асноўная катэгорыя. Прагматычны статус вербалізаванай сітуацыі змяняецца разам са зменай функцыянальнага рэгістра. ***Змястоўна-фактуальная інфармацыя*** адлюстроўвае падзеі, працэсы, якія ўжо адбыліся, адбываюцца ці яшчэ адбудуцца. Дапускаецца гіпатэтычнасць, супастаўленне фактаў, іх характарыстыка, меркаванні адносна вырашэння пэўных праблем: "*Ніжняя палата беларускага парламента ўчора прыняла дапаўненні і змяненні ў некаторыя кодэксы па пытаннях спагнання аліментаў на дзяцей. Паводле прапановы парламентарыяў, на ўтрыманне сваіх няпоўнагадовых нашчадкаў бацькі будуць абавязаны выдаткоўваць 50 працэнтаў бюджэту пражытковага мінімуму штомесяц – на аднаго дзіця, 75 – на дваіх, 100 працэнтаў – на траіх і больш. Законапраектам прадугледжана таксама, што бацькі могуць добраахвотна дамовіцца паміж сабой аб выплаце аліментаў, заключыўшы адпаведнае пагадненне. …Пры заключэнні пагаднення паміж бацькамі аліменты можна замяніць пэўнымі матэрыяльнымі каштоўнасцямі або маёмасцю. Скажам, перадаў кватэру – лічы, ад рэгулярных выплат пазбавіўся"* (*"Звязда" 2008: 22 кастрычніка*). Трэба падкрэсліць, што змястоўна-фактуальная інфармацыя заўсёды вербалізавана, таму рэалізуецца праз моўныя сродкі з прамым прадметна-лагічным значэннем, зафіксаваным у слоўніках.

У большасці выпадкаў інфармацыя (у шырокім разуменні значэння гэтага слова) утрымлівае індывідуальна-аўтарскае разуменне ўзаемаадносін паміж з'явамі фактуальнай прасторы, што патрабуе творчага асэнсавання: не заўсёды рэчаіснасць адлюстравана аўтарам тэксту ў яе аб'ектыўнай рэальнасці. Напрыклад:

*Дзе – старасць,*
*дзе – маладосць?!.*
*Зацвілі яблыні сёння.*
А. Разанаў

Менавіта па гэтых дыферэнцыяльных прыметах вылучаюць ***змястоўна-канцэптуальную інфармацыю***. Няпэўнасць (энтрапія), неакрэсленасць адлюстравання свету ў тэксце здымаецца "эстэтыка-пазнавальнай дзейнасцю", заўсёды звязанай з інтэрпрэтацыяй. Як адзначаюць даследчыкі, змястоўна-канцэптуальная інфармацыя – "катэгорыя тэкстаў мастацкіх, хаця можа быць выяўлена з навукова-пазнавальных тэкстаў. Адрозненне толькі ў тым, што змястоўна-канцэптуальная інфармацыя ў навуковых тэкстах заўсёды выражана дастаткова празрыста …" [*Гальперин 1981: 28*].

У пэўнай ступені можна казать пра тое, што вытлумачэнне тэксту, раскрыццё яго глыбіннага зместу абумоўлены пошукамі змястоўна-канцэптуальнай інфармацыі:

*Вясёлы і ў сваёй пакуце*
*І сумны –*
*Радасці назло –*
*Гук выдзімаюць, як у гуце*
*Са шкла гарачага святло.*

Р. Барадулін

***Змястоўна-падтэкставая інфармацыя*** – гэта “прадукт” асацыятыўнай дзейнасці чалавека, уключэння ім у працэс усведамлення рэчаіснасці патэнцыяльных магчымасцей моўных адзінак спараджаць паралельныя канататыўныя планы. Гэтая інфармацыя не заўсёды праяўляецца ў тэксце. Праявамі гэтай “двупланавасці” з’яўляецца выкарыстанне аўтарам мастацкага тэксту такіх моўна-выяўлечых сродкаў, як метафара, метанімія, перыфраз, параўнанне, алегорыя, сімвал і інш. Напрыклад, вядомыя разанаўскія вершасказы пабудаваны на ледзь улоўнай асацыятыўнай сувязі сутнасці прадмета і яго вербалізаванага моўнага знака: *Грошы ахрышчваюць грахі, але самі яны хрышчоныя сонцам – Хорсам. Грошы вырошчваюцца з душаў рэчаў, але ўрошчаюцца ў чалавечыя душы: кім валодаюць яны – таго яны горшаюць, хто валодае імі – таго яны ўхарошваюць.*

Усё вышэй сказанае яшчэ раз падкрэслівае важнасць і неабходнасць удумлівага прачытання тэксту, асабліва мастацкага, бо менавіта ў ім адлюстраваны як свет, так і чалавек у ім, усведамленне іх тоеснасці ці асобнасці.

**Літаратура**

1. *Гальперин, И. Р.* Текст как объект лингвистического исследования / И. Р. Гальперин. – М., 1981. – 139 с.

**А. Л. Садоўская**

## ЭТНАЛІНГВІСТЫКА ЯК НАВУКА. ЗАДАЧЫ І МЭТЫ, АБ’ЕКТ І ПРАДМЕТ ЭТНАЛІНГВІСТЫЧНАГА ДАСЛЕДАВАННЯ

1. *Этналінгвістыка* ў нашай гуманітарнай навуцы – параўнальна новая дысцыпліна, таму пытанні вызначэння межаў і аб’ёму самога паняцця этналінгвістыкі як навукі і, адпаведна, яе статусу сярод іншых гуманітарных дысцыплін, а таксама мэтаў і задач, аб’екта і прадмета этналінгвістычнага даследавання да сённяшняга дня не маюць адназначнага вырашэння. Дыскусійны характар нават асноватворных пытанняў этналінгвістыкі абумоўлены, на нашу думку, не толькі маладым узростам названай навукі, але і адрозненнем ў сучаснай славістыцы двух асноўных агульнапрызнаных цэнтраў гэтага напрамку, так званых этналінгвістычных школ, якія, хоць і блізкія ў сваіх трактоўках этналінгвістыкі і яе асноўных метадалагічных палажэнняў, але і маюць відавочныя разыходжанні ў сваіх падыходах да яе (маюцца на ўвазе маскоўская і польская (люблінская) этналінвістычныя школы). Аднак перш